Падтрымай "Вясну" на PATREON

Яшчэ аднаго мінчука асудзілі на тры гады "хатняй хіміі" за ўдзел у пратэсце 9 жніўня

06.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



У ноч з 9 на 10 жніўня 2020 года. Ілюстрацыйнае фота з суполкі "Фатографы супраць"

У судзе Цэнтральнага раёна 5 лістапада вынеслі прысуд Вадзіму Вінаградаву, якога абвінавачвалі ў актыўным удзеле ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак за падзеі ў ноч з 9 на 10 жніўня.

Справу разглядала суддзя **Юлія Густыр**, бок дзяржаўнага абвінавачвання прадстаўляў **Цімафей Нічапарук**.

Паводле абвінавачвання, **Вадзім Вінаградаў** з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў і пратэсту прыняў сумесна з групай асобаў удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве ў перыяд з 16.00 гадзін 9 жніўня да 01.00 гадзін 10 жніўня 2020 года на скрыжаванні пр. Пераможцаў і

пр. Машэрава ў Мінску: гучна выкрыкваў лозунгі, здзяйсняў воплескі рукамі, станавіўся ў счэпку, неаднаразова адмовіўся выканаць законныя патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі, перашкаджаў руху грамадскага транспарту і нармальнаму функцыянаванню прадпрыемстваў. Сваімі дзеяннямі абвінавачаны здзейсніў злачынства, адказнасць за якое прадугледжаная ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса.

Вінаградаў прызнаў сваю віну цалкам, у зробленым раскаяўся, у судзе абараняў сябе сам. Да таго, як даведаўся аб распачынанні крымінальнай справы, прыйшоў з яўкай з павіннай у ГУБАЗ, бо даведаўся пра затрыманне сябра, з якім былі разам на фота.

У судзе Вінаградаў распавёў, што 9 жніўня каля 16 гадзін ён схадзіў на ўчастак і прагаласаваў, пасля сустрэўся з сябрамі, чакалі каля ўчастка папярэдніх вынікаў выбараў, а потым паехалі ў горад выказаць сваё расчараванне: усе телеграм-каналы пісалі, што выбары сфальсіфікавалі. На пытанні пракурора пагадзіўся, што паддаўся заклікам телеграм-каналаў Нехта, Нехта Лайф і іншых. Да Стэлы абвінавачаны прыехаў каля 21 гадзін, там ужо было шмат людзей, у іх былі ліхтарыкі, абстаноўка была ціхай і спакойнай, але ўчастак каля Стэлы быў ачэплены супрацоўнікамі міліцыі, а рух транспарту ўжо быў перакрыты супрацоўнікамі ДАІ. У нейкі момант міліцыянты сталі адціскаць людзей, пратэстоўцы спускаліся да дарогі, у нейкі момант сталі падыходзіць бліжэй адзін да аднаго, каб засцерагчы сябе, хтосьці ўзяў кагосьці пад рукі, але як такой счэпкі не было. Таксама людзі пляскалі ў далоні, выкрыквалі лозунгі, у тым ліку "Жыве Беларусь". На праезную частку абвінавачаны выйшаў не адразу, а толькі калі стала вельмі шмат людзей, і яны проста не змяшчаліся на тратуары. Блакаваць рух транспарту Вадзім не збіраўся.

Калі выбухнула святло-шумавая граната Вінаградаў спалохаўся і ўцёк, пасля з'ехаў дадому.

У пісьмовых матэрыялах справы былі фота са СМІ і скрыншоты старонак у сацыяльных сетках, якія тычацца масавага мерапрыемства з 9 на 10 жніўня, пратакол допыту, дзе сярод іншага Вінаградаў казаў, што знаходзіўся ў тэлеграм-чаце "Беларусы", дзе было каля 20 удзельнікаў: абмяркоўвалі беспарадкі, якія адбываліся ў краіне, і каардынавалі дзеянні па ўдзеле ў пратэстным руху. На маршы абвінавачаны выходзіў каля чатырох разоў.

У спрэчках бакоў пракурор адзначыў, што змякчальнай акалічнасцю з'яўляецца яўка з павіннай і наяўнасць малалетняга дзіцяці, прасіў суд прызначыў Вінаградаву тры гады "хатняй хіміі". Абвінавачаны сказаў, што яго пасыл быў мірны, ён проста хацеў выказаць меркаванне і ні ў якім разе не хацеў прычыніць нейкую шкоду.

У выніку суд прызнаў Вадзіма Вінаградава вінаватым паводле ч. 1 арт. 342 КК і прызначыў яму **пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову тэрмінам на тры гады.**

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 920 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY